Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва
Кафедра этналогіі і фальклору

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_________В.В.Калацэй
01 верасня 2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

__________Н.У.Карчэўская
27 красавіка 2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СПЕЦЫЯЛІСТА

для спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці
1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)

Складальнік:
Э.К. Дарашэвіч, доктар філасофскіх навук, прафесар ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 23 мая 2017 г.
пратакол № 9

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск, 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Э.К. Дарашэвіч, доктар філасофскіх навук, прафесар ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Рэцэнзенты:**
*кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*Т.І. Кухаронак, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**
*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);
*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27 красавіка 2017 г. № 9);
*саветам установы адукацыі* «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9 ).

Адказны за рэдакцыю: А.У.Рагуля
Адказны за выпуск: Э.К. Дарашэвіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………… 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ..……………..…………………….... 7
2.1 Навучальны дапаможнік па дысцыпліне «Тэорыя фальклору»........................................................................... 7
2.2 Канспекты (тэксты лекцый)…………..……………………… 8

3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……...……………………… 12
3.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы …………… 12
3.2 Пералік пытанняў да заліку……..………………………….. 14
3.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў...… 16

4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ..………………………………….. 19
4.1 Асноўная літаратура ………………...………………………… 19
4.2 Дадатковая літаратура..………………………………..……… 20

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» стварае прадумовы для засваення розных аспектаў комплекса тэарэтычных («Вусная народная творчасць: Тэорыя фальклору», «Прафесійная педагогіка», «Сацыяльна-культурная дзейнасць») і практычных («Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Фальклорны практыкум») дысцыплін і забяспечвае фарміраванне базы тэарэтычных ведаў, неабходных пры праходжанні вытворчай і канцэртна-выканальніцкай практык. Ва ўзаемадзеянні названых агульных дысцыплін і профільных практыкумаў вучэбна-метадычны комплекс «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» акумуліруе прынцыпы аптымальнай арганізацыі навучання ва ўніверсітэце і разглядае інавацыйныя тэхналогіі ўкаранення вынікаў адукацыі ў сучасную сацыякультурную практыку.

**Мэта ВМК** – засваенне метадаў, уменняў і навыкаў у галіне арганізацыі навучання ва ўніверсітэце.

**Задачы дысцыпліны:**

- азнаямленне са спецыфікай адукацыйнай дзейнасці будучага спецыяліста па народнай творчасці;
- удакладненне месца розных відаў навучання (аўдыторнага, пазааўдыторнага) у падрыхтоўцы да будучай прафесійнай дзейнасці;
- азнаямленне са спецыфікай структуры, арганізацыі і кіравання адукацыйным працэсам.

**У выніку вывучэння дысцыпліны** «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста » студэнт **павінен ведаць:**

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, якія разглядаюцца ў межах дысцыпліны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- структуру, гісторыю, асновы арганізацыі навучання, навукова-даследчай і самастойнай работы ўніверсітэту;
- асноўныя патрабаванні да спецыялістаў галіны практычнай фалькларыстыкі, іх месцы працы ва ўстановах сацыякультурнай сферы;
- свае правы і абавязкі

**умець:**

- вырашаць пастаўленыя прафесійныя задачы арганізацыйнага і даследчага планаў;
- рацыянальна арганізоўваць працу, свой працоўны час;
- авалодаць навыкамі вывучэння і засваення вучэбнага матэрыялу;
- працаваць з літаратурай, карыстацца бібліятэкамі, сеткамі інтэрнэт, фальклорнымі архівамі.

Тэхналагічны інструментарый выкладання дысцыпліны прадстаўлены наступнымі педагагічнымі метадамі навучання:

па крыніцы перадачы і ўспрымання інфармацыі: вусныя (гутарка, апавяданне), наглядныя (знаёмства з дэпаніраваным навукова-метадычным фондам, з аўдыё-відэа матэрыяламі), практычныя (пісьмовыя аналітычныя работы і вучэбна-метадычныя распрацоўкі);

па характары пазнавальнай і праектнай дзейнасці: рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя, пошукавыя, творчыя;

па відах вучэбных заняткаў і дыдактычнай задачы: тлумачэнне, практыкаванне, аналіз, замацаванне.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па дысцыпліне і ўключае наступныя заданні: работа з даследчай і вучэбна-метадычнай літаратурай; фарміраванне медыятэк; работа з дакументацыей па выяўленні і наданні статуса гісторыка-культурнай спадчыны; прагляд відэаматэрыялаў паводле спецыфікі працы, наведванне канцэртаў, выстаў народнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» ўсяго прадугледжана 118 гадзін, з якіх 62 гадзіны – аўдыторныя заняткі (36 г. – лекцыі, 20 г. – практычныя заняткі, 6 г. – семінарскія заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Навучальны дапаможнік па дысцыпліне

2.Дарашэвіч, Э. У тэзаўрусе Беларусі:да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча / уклад. М.А. Козенка ; навук. рэд. В.Калацэй. – Мінска : выдавецтва “Чатыры чверці”, 2011. – 136с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 Канспекты (тэксты лекцый)

### Уводзіны

Дэфініцыі «адукацыя», «спецыяльнасць», «напрамак спецыяльнасці», «спецыялізацыя», «народная творчасць», іх этымалогія і значэнне. Творчы працэс як складовая эстэтычнага пераасэнсавання Сусвету і як частка жыццезабеспячэння чалавека. Паходжанне асноўных відаў і жанраў мастацтва і навучанне ім. Першыя ўніверсітэты Сярэднявечча. Заснаванне, статус, правы і самакіраванне еўрапейскіх універсітэтаў, Віленскага і Маскоўскага ўніверсітэтаў. Навучанне ва ўніверсітэце як сродак развіцця асобы студэнта, авалодання ім сістэмай ведаў і ўменняў, фарміравання яго маралі і эстэтычных ідэалаў.

### Тэма 1. Арганізацыя і структура ўніверсітэцкай адукацыі

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”: гісторыя, структура, прыярытэты мастацкай і этнамастацкай адукацыі. Спецыфіка работы адміністрацыйных адзінак універсітэта. Тры адміністрацыйныя ўзроўні структуры ўніверсітэта: адміністрацыя ўніверсіэта (рэктар, рэктарат), факультэта (дэкан, намеснікі дэкана, работнікі дэканата), кафедры (загадчык, прафесарска-выкладчыцкі склад). Асноўныя вучэбныя і навуковыя падраздзяленні ўніверсітэта – агульнаўніверсітэцкія і спецыяльныя кафедры. Самакіраванне ў вышэйшай школе. Асаблівасці студэнцкага самакіравання.

### Тэма 2 . Прафесійная дзейнасць спецыялістаў сацыякультурнай сферы

Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці: гуманізацыя працэсаў выхавання і навучання, свабода творчай дзейнасці і самаразвіцця культурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсаў, адмова ад манапалізму ў культуры, усеагульная масавая культуратворчасць, дыялектычнае адзінства і пераемнасць культурна-гістарычнага, нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый, спалучэнне дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у арганізацыі культурнай дзейнасці. Сацыякультурная сфера як сукупнасць грамадскіх інстытутаў: установу мастацтва, устаноў культуры, навукова-асветніцкіх устаноў, забаўляльна-камерцыйных устаноў, санаторных і спартыўных устаноў, мастацка-адукацыйных устаноў, устаноў культуры новага тыпу. Характар дзейнасці спецыяліста сацыякультурнай сферы.

## Тэма 3 . Мадэль спецыяліста ў галіне практычнай фалькларыстыкі

Мадэль спецыяліста: да чаго павінны быць прыгодны спецыяліст у галіне практычнай фалькларыстыкі: мэты, сэнс, умовы яго дзейнасці, яго функцыі і асноўныя навыкі, неабходныя для прафесійнай дзейнасці. Функцыі, да выканання якіх падрыхтаваны спецыяліст у галіне практычнай фалькларыстыкі: адаптацыйная, развіццёвая, адукацыйная, культурааарыентуючая, культураахоўная, рэкрэацыйна-аздараўленчая, камунікацыйная. Якасці, якімі валодае спецыяліст у галіне практычнай фалькларыстыкі: кампетэнцыі (сацыяльна-асобасная, агульнапрафесіянальная, спецыяльная) і прафесіянальная гатоўнасць (арганізацыйныя здольнасці, кампетэнтнасць кіраўніка, прадпрымальнасць, духоўна-маральная накіраванасць актыўнасці, духоўнасць і адказнасць, прыярытэт духоўна-маральных асноў у прафесійнай дзейнасці, арыентаванасць на лепшыя ўзоры сусветнай і айчыннай фалькларыстыкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста па фальклоры

Паняцце «кваліфікацыя» як адлюстраванне якаснага боку падрыхоўкі спецыяліста. Месца спецыяліста ў грамадскай вытворчасці, складанасць і характар працы як ўмовы, якія вызначаюць кваліфікацыю. Узровень прафесіяналізму спецыяліста сацыякультурнай сферы і фактары, якія яго вызначаюць. Прафесійна значныя якасці спецыяліста сацыякультурнай сферы: праекціровачна-канструктыўныя, арганізатарскія, камунікатыўныя, гнасеалагічныя, маральныя. Спецыяліст па народнай творчасці як яе даследчык, ахоўнік і транслятар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 5. Арганізацыя адукацыйнага працэсу

Тыпавыя і вучэбныя планы і расклад заняткаў, іх асаблівасці ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Формы арганізацыі адукацыйнага працэсу ўстановы вышэйшай адукацыі: тэарэтычныя (лекцыя, семінар, курсавая і дыпломная работа, кансультацыя, вучэбная экскурсія), практычныя (лабараторна-практычныя заняткі, практыкумы), камбінаваныя (педагагічная і вытворчыя практыкі), кантрольныя (калёквіум, залік, экзамен). Улік і ацэнка ведаў студэнтаў як сродкі кіравання вучэбнай працай студэнта і якасцю навучання. Бягучы, тэматычны, выніковы віды ўліку ацэнкі ведаў. Курсавыя работы, экзамены і залікі. Дзяржаўныя экзамены і дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі. Дыпломныя праекты, звязаныя з народнай творчасцю.

## Тэма 6 . Навукова-даследчая і самастойная работа студэнта

Павышэнне ўзроўню адукацыі і фарміраванне навукова-матэрыялістычнага светапогляду студэнтаў як вынік атрымання за час навучання ў ВНУ навыкаў самастойнай работы і засваення метадаў

арганізацыі і выканання навуковых даследаванняў. Асаблівасці навуковай дзейнасці студэнтаў. Здольнасці да навуковай работы як умова паступлення ў магістратуру і аспірантуру. Студэнцкія навуковыя супольніцтвы. Самастойная работа студэнтаў (СРС) як форма адукацыйнага працэсу. Віды індывідуальнай і групавой самастойнай работы. Формы педагагінага кантролю СРС. Модульна-рэйтынгавая сістэма арганізацыі самастойнай работы студэнтаў і кантролю ведаў.

## Тэма 7. Інфармацыйная культура спецыяліста па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і практычнай фалькларыстыцы

Інфармацыйная культура спецыяліста як аб'яднанне назапашанай грамадствам сацыяльнай інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, масавасці выкарыстання інфармацыі ў грамадстве і яе даступнасці для асобы. Структура інфармацыйнай культуры асобы як аб'яднанне культуры інфармацыйных паводзін і культуры інфармацыйнай дзейнасці з культурай збору-пошуку інфармацыі. Інфармацыйна-метадычныя асновы методыкі збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці. Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА як гарантыя жывога бытавання традыцыі. Інфармацыйная аснова выяўлення і надання статуса гісторыка-культурнай спадчыны элементам побытавай і светасузіральнай народнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 3.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы

**Выкананне самастойнай работы па дысцыпліне** «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» **прадугледжана вучэбнымі планамі факультэта ТБКіСМ і абавязкова для кожнага студэнта.**

Кантралюемая самастойная работа выконваецца па агульным напрамку «Універсітэцкая адукацыя і патрэбы сучаснай практычнай фалькларыстыцы» ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэмаў, якія прыведзеныя ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры і выкарыстаных крыніц.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па дысцыпліне.

***Формы выканання самастойнай работы:***

- Напісанне рэферату (не менш 12 старонак)
- Распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў)
- Распрацоўка аўдыёвізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі)

*Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:*

1. Першыя ўніверсітэты і народазнаўства: Віленскі ўніверсітэт.
2. Першыя ўніверсітэты і народазнаўства: Оксфард.
3. Першыя ўніверсітэты і народазнаўства: Сарбонна.
4. Першыя ўніверсітэты і народазнаўства: Кембрыдж.
5. Універсітэцкая падрыхтоўка сучаснага фалькларыста-практыка: камунікацыйныя мэты, інтэнцыі і перспектывы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Універсітэцкая падрыхтоўка па практычнай фалькларыстыцы як віду сацыякультурнай дзейнасці.
7. Універсітэцкая падрыхтоўка і мадэль спецыяліста па захаванні фальклору і нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.
8. Універсітэцкая падрыхтоўка фалькларыста і навуковая спадчына Яўгена Гіпіуса.
9. Універсітэцкая падрыхтоўка фалькларыста і навуковая спадчына Марыі Гімбутас.
10. Універсітэцкая падрыхтоўка фалькларыста і навуковая спадчына Зінаіды Мажэйка.
11. Універсітэцкая падрыхтоўка фалькларыста і навуковая спадчына Міколы Крукоўскага.
12. Структура інфармацыйнай базы спецыяліста па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ўніверсітэцкая адукацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2 Пытанні да заліку

1. Першыя ўніверсітэты.
2. Правы і абавязкі выкладчыкаў і студэнтаў.
3. Асаблівасці сучаснага ўніверсітэцкага і студэнцкага самакіравання.
4. Гісторыя БДУКМ.
5. Структура БДУКМ.
6. Спецыфіка работы адміністрацыі універсітэта розных узроўняў.
7. Сэнс дзейнасці. Камунікацыйныя мэты, інтэнцыі і перспектывы.
8. Прававая база.
9. Месца ў галінах дзяржаўных інстытутаў культуры і адукацыі.
10. Практычная фалькларыстыка як від сацыякультурнай дзейнасці.
11. Функцыі сацыякультурнай дзейнасці.
12. Мадэль спецыяліста па захаванні фальклору.
13. Поспех прафесійнай дзейнасці
14. Якасць прафесійнай дзейнасці
15. Узровень прафесіяналізму і прафесіянальна значныя якасці
16. Вучэбныя планы, расклад заняткаў.
17. Формы аргантзацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ.
18. Улік і ацэнка ведаў студэнтаў.
19. Дзяржаўныя экзамены. Дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі.
20. Арганізацыя навуковай работы.
21. Асаблівасці навуковай дзейнасці студэнтаў.
22. Магістратура і аспірантура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. Студэнцкае навуковае супольніцтва

24. Структура інфармацыйнай культуры спецыяліста па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

25. Аспекты інфармацыйнай культуры спецыяліста па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і практычнай фалькларыстыцы.

26. Змест (тэзаўрус) і працэсы інфармацыйнай культуры спецыяліста па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і практычнай фалькларыстыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення фальклору). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля адукацыи щ ВНУ), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблемадукацыі ў ВНУ, фармуліроўка вывадаў. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльна-карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі культуры, праблемах і тэндэнцыях этнамастацкай адукацыі. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

- падрыхтоўка прэзентацый;
- падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
- напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
- вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 4.1 Асноўная літаратура


1. Болонский процесс : нарастающая динамика и своеобразие / под науч. ред. В.И.Байденко. – М. : Исследовательский центр проблем качества подготовки специалистов, 2002. – 408с.
2. Восточнославянский фольклор: слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.
3. Высшее образование Республики Беларусь: нормативно-правовое регулирование: сб.норм.-прав.актов / сост. И.В.Титович [и др.] – Минск : РИВШ, 2006. – 222 с.
4. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.
5. Кабашнікаў, К.П. Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці / К.П. Кабашнікаў / АН БССР Ин-т МЭФ. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 47 с. : іл.
6. Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання / Бел. дабраахвотнае т-ва аховы помнікаў гіст. і к-ры. Сектар этнаграфіі ІМЭФ АН БССР; Пад рэд. В.К.Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 150с. : іл.
7. Хейзинга, Й. Homo ludens. В тени завтрашнего дня / Й. Хейзинга; пер. с нидерланд. и примеч. В.В. Ошиса ; общ. ред. и послесл. Г.М. Тавризян. – М. : Прогресс : Прогресс-Академия, 1992. – 464 с.
8. Хвир, Н. Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н. Хвир // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29 – 30 красавіка 2009 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2009. – С. 34 – 35.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Дадатковая літаратура

1. Буланов, А. Обучение по модульным программам / А.Буланов // Народное образование. – 1999. – № 7-8. – С. 87 – 88.

2. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2002. – 164, [1] с.

3. Данилова, М.М. Организация самостоятельной работы студентов / М.М.Данилова. – М.: Знание, 1990. – 47 с.

4. Фядосік, А.С. Прынцыпы класіфікацыі і выдання фальклорных твораў у шматтомным зводзе беларускай народнай творчасці ў параўнальным супастаўленні са зводамі іншых славянскіх народаў : Даклады /АН БССР Бел. кам-т славістаў / А.С.Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983.– 44 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ